# Таямнічыя мясціны пісьменніка

**...120-годдзя класіка беларускай ...аратуры, першага раманіста Беларусі ...зьмы Чорнага на тэрыторыі музея ...ў установлены знак-указальнік ...сцін у Цімкавічах і іх ваколіцах, ...язаных з яго жыццём і дзейнасцю.**

...огія наведвальнікі музея пасля экскурсіі едуць ...адну з гэтых мясцін, каб дакрануцца да гісторыі: ...йсці па Капыльскай вуліцы, дзе жыў Мікалай ...аноўскі з 1908 па 1923 год, напіцца сцюдзёнай ...ы з Бушылаўскай крынічкі, дакрануцца да стага-...ых дрэў Радзівілаўскага парку, якія бачылі мала-...а пісьменніка, пакланіцца памяці продкаў класіка ...Цімкавіцкіх праваслаўных могілках, адчуць водар ...ёвага Скіп'ёўскага лесу, а можа і даехаць да Бо-..., дзе нарадзіўся Кузьма Чорны.

...апыльская вуліца адна са старэйшых вуліц ...кавіч, назва якой не мянялася амаль 500 гадоў. Тут ... дзед Міколы па бацькавай лініі Раманоўскі Фелікс, ...-сурвэтнік. Гэта месца на Капыльскай вуліцы ...ілася яшчэ і тым, што нават у самую суш краса-...ася каля яго сядзібы велізарная лужына. На ёй ...ходзілася двухкласнае вучылішча, якое закончыў




Мікола ў 1916 годзе. На Капыльскай вуліцы жыла і дзяўчынка Саша Даменя – Міколава першае каханне.

З вялікай радасцю пісьменнік заўсёды вяртаўся ў бацькоўскую хату: і калі вучыўся ў Нясвіжскай настаўніцкай семінарыі, і калі жыў і працаваў у Мінску. Шкада, што зараз гэта хата не захавалася. Яна згарэла ў 1933 годзе, калі вялікі пажар на Капыльскай вуліцы вымеў паўмястэчка. Засталася толькі студня, ваду з якой брала яшчэ сям'я Раманоўскіх.

Сёння многія цімкаўляне наведваюцца на Бушылаўскую крынічку па ваду. Яе не міналі і маленькі Коля са сваёй маці, калі ішлі спяваць у хоры ў Скіп'ёўскую царкву. У народзе і зараз лічыцца, што гэта вада гоіць вочы.

У Скіп'ёве і Бушылаве дзед Міхал Парыбак-Чорны вучыў маленькага Колю чытаць кнігу, назва якой – «Беларуская прырода». Калі прыходзіла вясна, дзед, апрануўшыся ў святочную вопратку, гаварыў: «Гэй, Каралькова армія – стройся! Пойдзем у Бушылава, ці Скіп'ёва вясну сустракаць». У лесе ён садзіўся на траву ў зацішку і расказваў дзецям, як жучок паўзе, як дрэвы гамоняць, як травінка да травінкі хіліцца. Любілі яны яшчэ слухаць спевы лясных птушак. «Слухай, слухай, як вытылінгвае!» – у захапленні гаварыў дзед, услухоўваючыся ў трэлі дразда ці якой-небудзь жаўтабрушкі. Нездарма потым Кузьме Чорнаму ўдавалася апісанне прыроды ў сваіх творах.

Прайшлі гады. Змяніўся Скіп'ёўскі лес, але птушкі спяваюць таксама. На месцы Скіп'ёўскага Перабродддзя, якое апісвае Кузьма Чорны ў сваёй незавершанай аповесці «Скіп'ёўскі лес», зараз знаходзіцца возера Доўгае, а дрэвы глядзяцца ў яго ваду.

Як успамінае Мікола Хведаровіч, сябар Кузьмы Чорнага: «У цёплы вясенні дзень мы бралі вуды і, мінаючы цяністы парк, спускаліся з пахілага пагорка ўніз, да люстраванага возера. Там адвязвалі човен і плылі ў зараслі рачулкі Мажы, туды, дзе ў зацішных пратоках вяліся дзябёлыя ліні і краснапёркі». Гаворка ідзе пра Радзівілаўскі парк, які знаходзіцца на ўскрайку Цімкавіч. Зараз цяністыя алеі парку збераглі сваю цішыню і перашэптваюцца пра мінулае.

Родзічы пісьменніка – яго бацькі, сёстры і дачка – пахаваны на Цімкавіцкіх праваслаўных могілках. Адзіная дачка Кузьмы Чорнага – Рагнеда Мікалаеўна Раманоўская – хоць і не часта бывала ў Цімкавічах, але вельмі любіла родную вёску свайго бацькі. Таму перад смерцю папрасіла пахаваць яе ў Цімкавічах.

Так атрымалася, што ўсе гэтыя знакамітыя мясціны маюць сваіх арандатараў, якія падтрымліваюць парадак і чысціню на іх. Літаратурны музей Кузьмы Чорнага вельмі ўдзячны дырэктару Капыльскай ЖКГ Дзмітрыю Дарафею, дырэктару ААТ «Капыльскае» Дзмітрыю Палевікову, дырэктару Капыльскага вопытнага лясгаса Сяргею Ульдзіновічу, кіраўніку «ПМК-11» ААТ «Салігорскводбуд» Леаніду Тароцьку, дырэктару філіяла «Аўтамабільны парк № 21» ААТ «Мінаблаўтатранс» Уладзіміру Сахару, старшыні Цімкавіцкага сельвыканкама Алене Острыкавай і іх калектывам. Яны разумець, што гэтыя мясціны вельмі важныя і значныя не толькі для Цімкавіч, але і для ўсёй Беларусі.


**Людміла НІЖЭВІЧ,**
загадчык філіяла «Літаратурны музей Кузьмы Чорнага» ўстановы «Дзяржаўны музей беларускай літаратуры»